Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні пасля вяртання ў Беларусь: хроніка пераследу 23 ліпеня

дапоўнена

23.07.2022 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, пераслед, рэпрэсіі, затрыманні

У Беларусі па-ранейшаму працягваюцца затрыманні, ператрусы, катаванні ў ізалятарах, аказваецца ціск на палітвязняў, незалежныя медыяпрадукты прызнаюць экстрэмісцкімі матэрыяламі. Адбываюцца рэпрэсіі ў дачыненні да грамадзян, якія актыўна выказваюць сваю пазіцыю ў адносінах да вайны, распачатай узброенымі сіламі Расіі. Праваабарончы цэнтр "Вясна" 23 ліпеня збірае апошнія факты палітычнага пераследу грамадзян Беларусі.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:

- ***праз тэлеграм-бот @viasna_bot;***
- ***на гарачую лінію ў тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna***

Затрыманы пасля вяртання з Польшчы

Праваабаронцам паведамілі пра затрыманне ў Лідзе сіраты **Валерыя Туміловіча**. Вядома, што месяц назад ён з'ехаў у Польшчы, але цяпер вырашыў вярнуцца ў Беларусь. Валерыю ставяць у віну арт. 19.11 КаАП (распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў), а таксама інкрымінуюць арт. 368 Крымінальнага кодэкса (абраза Лукашэнкі).

Пасля вяртання з Літвы сілавікі затрымалі супрацоўніцу EPAM



Праўладныя тэлеграм-каналы паведамляюць, што дзяўчына была актыўнай удзельніцай пратэстаў у 2020 годзе і ў канцы таго ж года пераехала ў Літву. Праз два гады яна вырашыла прыехаць у Беларусь да сяброўкі, дзе і была затрымана.

На «пакаяльным відэа» яна «прызнаецца» ва ўдзеле ў пратэстах і перакрыцці руху транспарту.

Па інфармацыі MAYDAY TEAM, затрыманая супрацоўніца EPAM — **Кацярына Глінская.** Яна была затрымана разам з сястрой **Юліяй Глінскай** некалькі дзён таму ў Мінску. Затрыманне рабіў ГУБАЗіК, дзяўчат схапілі, калі яны ішлі да свайго аўтамабіля. Затым у кватэры зрабілі ператрус.

Вядома, што Кацярына праходзіць фігурантам па крымінальнай справе. Яе ж сястры Юліі суд у чацвер, паводле непацверджанай інфармацыі, прызначыў 15 сутак арышту — пакуль незразумела за што.

За перыяд знікнення Паліна Шарэнда-Панасюк 20 содняў правяла ў ШІЗА. Сваякам не даслалі апавяшчэнне аб прыбыцці Паліны ў калонію



Паліна Шарэнда-Панасюк

Больш за месяц Паліну шукалі праз адваката. Яна знайшлася ў жаночай папраўчай калоніі №24 (Зарэчча), куды яе перавялі з СІЗА №3 Гомеля. Муж Паліны Андрэй Шарэнда паведаміў, што ў калоніі яна 20 содняў правяла ў ШІЗА.

Згодна з Крымінальна-выканаўчым кодэксам, *на працягу трох сутак з дня прыбыцця асуджанага ва ўстанову адміністрацыя ўстановы накіроўвае яго блізкім сваякам паведамленне*. **Аднак сваякі Паліны яго не атрымлівалі**.

Нагадаем, што 7 красавіка Паліне дадалі яшчэ год калоніі да асноўнага тэрміну ў два гады зняволення.

На суткі адправілі двух вернікаў адной з мінскіх цэркваў — падчас ператрусу ў іх канфіскавалі ўлёткі «Малітва за Беларусь»

Раніцай 22 ліпеня ў сябе дома былі затрыманы жыхары Мінска **Яўген Барысік** і **Максім Стасілевіч**, вернікі адной з мінскіх цэркваў Хрысціян веры евангельскай, паведамляе Польскае радыё.

Падчас затрымання ў іх былі канфіскаваны пакункі ўлётак «Малітва за Беларусь», якія ўтрымліваюць заклік маліцца за краіну і народ «у гэты няпросты час», цытаты з Евангелля і евангельскі гімн «Чакаем цябе, наш Ісус».

Як паведаміла жонка і сястра затрыманых, хлопцам прызначылі па 10 сутак арышту: Максіму за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў (арт.19.11 КаАП), Яўгену — за дробнае хуліганства (арт. 19.1 КаАП). Судзіла іх суддзя **Таццяна Мотыль**.

У Беларусі заблакавалі сайт газеты «Беларусы і рынак»

У самім выданні пацвердзілі, што сайт быў заблакаваны паводле рашэння Міністэрства інфармацыі. Пры гэтым адзначылі, што афіцыйных папер наконт гэтага пакуль не атрымлівалі.

Твитнуть









"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ



"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"

Праз 27 гадоў рэпрэсій і пераследу "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Заява аб прызнанні палітвязнямі Аляксея Камароўскага, Іллі Шакірава і Барыса Протасава

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі

АБСЕ

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Праз 27 гадоў рэпрэсій і пераследу "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

